# Гісторыя

У. К. КОРШУК, А. Ф. МАКАРЭВІЧ

## ПОДЗВІГ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

**(Да 45-годдзя вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў)**

Вызваленне Беларусі ў ліпені 1944 года ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — вынік гераічных намаганняў усяго савецкага народа. На фронце і ў тыле, у партызанскіх атрадах і ў падполлі з бяспрыкладнай стойкасцю і адважнасцю савецкія людзі рабілі свяшчэнную патрыятычную справу разгрому ворага, абароны Айчыны, сваіх ідэалаў, свайго ладу жыцця. Беларускі народ ганарыцца тым, што ў адзіным страі мужных абаронцаў сацыялістычнай Радзімы з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны стойка змагалася няскораная Беларусь.

Неўміручай славай пакрылі сябе абаронцы Брэсцкай крэпасці. Цяжкія баі вялі нашы часці пад Маларытай, Жабінкай, Гродна, Беластокам, Лідай. Гераічна абаранялі Мінск байцы і камандзіры 64-й і 100-й, 108-й і 161-й дывізій.

Мужна змагаліся абаронцы Магілёва — воіны 61-га стралковага корпуса пад камандаваннем генерал-маёра Ф. А. Бакуніна. Тысячы жыхароў удзельнічалі ў будаўніцтве абарончых умацаванняў. У асобныя дні ў гэтых работах удзельнічала да 40 тыс. чалавек. Па закліку партыйнай арганізацыі каля 12 тыс. патрыётаў уступілі ў рады народнага апалчэння. Абаронцы Магілёва скавалі наступленне групы армій «Цэнтр» на маскоўскім напрамку, што дазволіла савецкаму камандаванню выйграць каштоўны час для падрыхтоўкі савецкіх войск да далейшых баёў.

Жорсткія баі ішлі летам пад Бабруйскам, Рагачовам, Жлобінам, Гомелем. У летніх баях 1941 года Чырвоная Армія нанесла ворагу цяжкі ўрон. Яна абяскровіла яго лепшыя дывізіі, стварыла перадумовы для зрыву плана «маланкавай вайны» супраць СССР. Толькі за першыя тры тыдні баёў фашысты, нават па заніжаных даных нямецкага камандавання, страцілі больш 100 тыс. салдат і афіцэраў, многа танкаў, самалётаў, іншай баявой тэхнікі [1].

Адным з яскравых праяўленняў адзінства арміі і народа з'явілася стварэнне знішчальных батальёнаў, груп самаабароны, а таксама народнага апалчэння, байцы якіх сумесна з часцямі Чырвонай Арміі са зброяй у руках удзельнічалі ў абароне гарадоў і вёсак. У першыя ж дні вайны знішчальныя батальёны пачалі дзейнічаць у Гомелі, Магілёве, Віцебску, Пінску, Кастрычніцкім, Ельскім, Лельчыцкім, Рагачоўскім і радзе іншых раёнаў.

Камуністычная партыя ў складанейшых умовах разгарнула вялікую работу па стварэнню партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп, распальванню ўсенароднай партызанскай вайны ў тыле ворага.

Усёй практычнай работай па стварэнню партыйнага падполля і арганізацыі першых партызанскіх груп і атрадаў у Беларусі кіраваў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. Пад яго кіраўніцтвам у гады нямецка-фашысцкай акупацыі на Беларусі дзейнічала 10 падпольных абкомаў, 8 гаркомаў, 2 гаркомы-райкомы, 11 міжрайкомаў, 6 міжрайпартцэнтраў, 166 сельскіх і гарадскіх райкомаў КП(б)Б, больш 1200 партыйных арганізацый партызанскіх атрадаў, 184 тэрытарыяльныя падпольныя арганізацыі, у якіх налічвалася звыш 35 тыс. камуністаў.

Адважна змагаліся з ворагам падпольныя камсамольскія арганізацыі. Камуністычнае падполле ўключала таксама патрыятычныя антыфашысцкія групы і арганізацыі, якія дзейнічалі ў заходніх абласцях рэспублікі.

Партызаны і падпольшчыкі Беларусі знішчалі жывую сілу захопнікаў, узрывалі і палілі масты, склады, знішчалі тэхніку, прамысловыя і іншыя аб'екты, грамілі нямецка-фашысцкія гарнізоны, штабы і камендатуры, раённыя і валасныя ўправы, зрывалі ваенныя, палітычныя, эканамічныя, адміністрацыйныя і іншыя мерапрыемствы гітлераўцаў. Асабліва значэнне надавалася ўдарам па камунікацыях, якія зрывалі планы перавозак войск і тэхнікі праціўніка, не дазвалялі вывозіць у Германію нарабаваную гітлераўцамі народную маёмасць і мірнае насельніцтва. На камунікацыях захопнікаў паспяхова дзейнічалі сотні дыверсійна-падрыўных партызанскіх груп.

Яркай старонкай у летапіс партызанскай барацьбы ўвайшла аперацыя пад назвай «Рэйкавая вайна». Яна была спланавана ЦШПД напярэдадні Курскай бітвы з мэтай аказання максімальнай дапамогі Чырвонай Арміі. Яе ажыццяўленне павінна было разбурыць важнейшыя чыгуначныя камунікацыі групы армій «Цэнтр». «Рэйкавая вайна» працягвалася з пачатку жніўня да сярэдзіны верасня 1943 года. За гэты час беларускія партызаны падарвалі больш 121 тыс. рэек, пусцілі пад адхон 836 эшалонаў праціўніка.

Беларускія партызаны грамілі гарнізоны і важныя апорныя пункты ворага. Тысячы населеных пунктаў, у тым ліку шэраг раённых цэнтраў, былі ачышчаны ад акупантаў і іх памагатых. На вызваленай тэрыторыі ствараліся партызанскія зоны, дзе аднаўлялася Савецкая ўлада, знаходзілі абарону і выратаванне ад фашысцкага тэрору сотні тысяч мірных грамадзян. Вызваленыя і кантралюемыя партызанамі раёны да канца 1943 года складалі 60 % тэрыторыі БССР.

У адзіным страі з партызанамі на барацьбу супраць акупантаў выступалі падпольшчыкі. У неверагодна цяжкіх і складаных умовах яны паспяхова выконвалі абавязкі сувязных, разведчыкаў, вялі агітацыйна-масавую работу, накіроўвалі ў атрады і брыгады папаўненне, зброю, боепрыпасы, медыкаменты, здзяйснялі смелыя дыверсіі на ваенных аб'ектах ворага, знішчалі фашысцкіх салдат і афіцэраў. У гераічны летапіс барацьбы беларускага народа супраць гітлераўскіх захопнікаў упісалі сваю старонку падпольшчыкі і жыхары Мінска пад кіраўніцтвам падпольнага гарадскога камітэта КП(б)Б.

Партызаны і падпольшчыкі заўсёды адчувалі ўсенародную падтрымку. Мясцовыя жыхары аказвалі партызанам і падпольшчыкам вялікую дапамогу: збіралі і перадавалі разведданыя аб праціўніку, былі праваднікамі, сувязнымі, здабывалі зброю і боепрыпасы, медыкаменты, забяспечвалі партызанскія фарміраванні прадуктамі і абмундзіраваннем, удзельнічалі ў баявых дзеяннях. Супраціўленне насельніцтва праяўлялася таксама ў адмове выконваць работу на ворага, у сабатажы і зрыве ваенных, эканамічных, палітычных, адміністрацыйных і іншых мерапрыемстваў акупацыйных улад.

Фашысцкія акупанты, імкнучыся знішчыць партызан, неаднаразова праводзілі карныя экспедыцыі, у якіх удзельнічалі буйныя сілы рэгулярных войск. Аднак акупантам не ўдалося разбіць партызанскі рух у Беларусі, таму што ён вырас з глыбінь народа і абапіраўся на народ, сілу і магутнасць Чырвонай Арміі, усёй нашай краіны, на тую неацэнную матэрыяльную і маральную дапамогу і падтрымку, якую аказваў беларускім партызанам савецкі тыл.

Армія народных мсціўцаў Беларусі налічвала больш 440 тыс. патрыётаў. З іх звыш 130 тыс. чалавек з'яўляліся камуністамі і камсамольцамі. У партызанскіх фарміраваннях і падпольных арганізацыях на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі побач з беларусамі гераічна змагаліся супраць захопнікаў рускія, украінцы, літоўцы, латышы, грузіны, казахі, армяне, узбекі, азербайджанцы, малдаване, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, а таксама палякі, славакі, чэхі, балгары, сербы, харваты, французы, венгры, немцы і інш.

За тры гады гераічнай барацьбы ў тыле ворага патрыёты знішчылі і ранілі больш 500 тыс. гітлераўцаў і іх памагатых, узарвалі і пусцілі пад адхон 11 128 эшалонаў і 34 бронепаязды, разбілі 948 штабоў і гарнізонаў, падарвалі і знішчылі больш 18 700 аўтамашын, збілі і спалілі 305 самалётаў, падбілі 1355 танкаў і бронемашын, знішчылі 438 гармат рознага калібру і 939 варожых складаў, захапілі 85 гармат, 278 мінамётаў,

1874 кулямёты, 20 917 вінтовак і аўтаматаў [2]. Болей чым тры гады ўдзень і ўначы партызаны і падпольшчыкі, мільёны савецкіх патрыётаў наводзілі жах і паніку на гітлераўскіх акупантаў, наносячы ім удар за ўдарам, набліжаючы запаветны дзень Вызвалення.

У верасні 1943 года Чырвоная Армія ўступіла ў Беларусь і да 1944 года ачысціла ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў каля 40 раёнаў рэспублікі. Раніцай 23 чэрвеня 1944 года пачалася адна з буйных бітваў Вялікай Айчыннай вайны — Беларуская наступальная аперацыя.

Па характару баявых дзеянняў і зместу задач гэта аперацыя дзеліцца на два этапы: першы — з 23 чэрвеня па 4 ліпеня і другі — з 5 ліпеня па 29 жніўня. На першым этапе войскі трох Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў правялі Віцебска-Аршанскую, Магілёўскую, Бабруйскую і Мінскую наступальныя аперацыі, у ходзе якіх былі разгромлены галоўныя сілы групы армій «Цэнтр», вызвалены Віцебск, Магілёў, Орша, Бабруйск, сталіца Беларусі Мінск і іншыя гарады рэспублікі. На другім этапе былі праведзены чатыры франтавыя аперацыі: Шаўляйская, Вільнюская, Беластоцкая і Люблін-Брэсцкая. Савецкія войскі прайшлі наперад да 400 км, пашырылі фронт наступлення да 1000 км і завяршылі знішчэнне акружанай статыстычнай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск у раёне на ўсход ад Мінска. Чырвоная Армія ачысціла ад нямецка-фашысцкіх акупантаў Беларускую ССР, значную частку Літвы і пачала баі за вызваленне Польшчы.

У ходзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў воінскія злучэнні і часці Чырвонай Арміі цесна ўзаемадзейнічалі з партызанскімі фарміраваннямі. У выніку паспяховага ажыццяўлення Беларускай аперацыі савецкія войскі і партызаны разбілі адну з найбольш моцных варожых груповак — групу армій «Цэнтр». Пры гэтым 17 дывізій і 3 брыгады былі поўнасцю знішчаны, 50 дывізій страцілі больш палавіны саставу [3].

Пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў было падлічана, што акупанты нанеслі народнай гаспадарцы і насельніцтву рэспублікі матэрыяльныя страты ў памеры 75 млрд. руб. Здавалася, што Савецкай дзяржаве спатрэбяцца многія і многія дзесяцігоддзі для таго, каб адрадзіць з попелу і руін гарады і вёскі, прамысловасць і сельскую гаспадарку, узняць дабрабыт народа.

Адразу пасля вызвалення адноўленыя партыйныя камітэты і арганізацыі КП(б)Б распрацавалі комплекс мерапрыемстваў па адраджэнню рэспублікі, усямернай дапамозе фронту. У выніку мэтанакіраваных дзеянняў ужо да канца 1944 года ўдалося пусціць у строй большасць прадпрыемстваў. Былі адноўлены заводы абароннага значэння, дзе арганізавалі рамонт ваеннай тэхнікі і вытворчасць некаторых ваенных матэрыялаў для Чырвонай Арміі. Ужо ў верасні 1944 года рабочыя Мінскага станкабудаўнічага завода імя К. Е. Варашылава перадалі фронту першую калону адрамантаваных танкаў. Да канца 1945 года ў Беларусі было ўзнята з руін 3404 прадпрыемствы, а ўсяго было адноўлена і пабудавана звыш 12 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, многія з якіх давалі прадукцыю арміі [4].

Адраджалася сельская гаспадарка рэспублікі. Разгарнуўся патрыятычны рух калгаснага сялянства за своечасовае правядзенне веснавой сяўбы ў фонд абароны. Працаўнікі вёскі, нягледзячы на вострыя недахоп трактараў, цяглавай сілы, рабочых рук, засявалі звыш плана «гектары абароны». Яны ўдзельнічалі ў папаўненні дзяржаўных прадуктовых рэсурсаў з асабістых запасаў. На 1 чэрвеня 1944 года сяляне вызваленых усходніх абласцей Беларусі здалі дзяржаве 21 485 т збожжа і 76 835 т бульбы [5].

Вялікая арганізатарская і палітычная работа была праведзена партыйным органамі рэспублікі па мабілізацыі працаўнікоў вёскі на правядзенне ўборачнай кампаніі, арганізацыю нарыхтовак збожжа і сельскагаспадарчых прадуктаў ураджая 1944 года. Дзяржаўны план нарыхтовак рэспублікай быў выкананы паспяхова: здадзена 240 тыс. т збожжа і 384 тыс. т бульбы. Акрамя таго, у фонд Чырвонай Арміі ад сялян Беларусі паступіла 48 тыс. т збожжа і 390 тыс. т бульбы [6].

На вызваленай тэрыторыі Беларусі па ініцыятыве працоўных рыхтаваліся і адпраўляліся на фронт рэчавыя падарункі і пасылкі. Усеагульнай увагай і клопатам народа былі акружаны раненыя воіны. Масавы характар набыў рух працоўных рэспублікі за збор сродкаў у фонд абароны Радзімы, на вытворчасць асобных відаў узбраення, за перадачу сродкаў для ўмацавання абараназдольнасці краіны па ваенных пазыках, грашова-рэчавай латарэі, грашовых укладах у ашчадныя касы. Усяго за час Вялікай

Айчыннай вайны агульныя паступленні грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцей ад працоўных Беларусі ў фонд Перамогі склалі звыш 1 млрд. руб.

У пераможнай барацьбе працоўных Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў удзельнічалі мільёны патрыётаў, якія мужна абаранялі заваёвы Кастрычніка, грамадскі прагрэс. У сэрцах працоўных рэспублікі ніколі не згасне пачуццё бязмежнай удзячнасці воінам доблеснай Савецкай Арміі — вызваліцелям Беларусі, усім народам сацыялістычнай Радзімы, і перш за ўсё вялікаму рускаму народу, за набытае шчасце жыць, працаваць і ствараць у адзінай, дружнай савецкай сям'і, з годнасцю і ўпэўненасцю глядзець у заўтрашні дзень.

[1] Гл.: Формирование коммунистической убежденности: Из опыта работы конференции КПСС вузов Белоруссии. Минск, 1984. С. 208.
[2] Гл.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Документы и материалы. Минск, 1967. Т. 1. С. 23.
[3] Гл.: История второй мировой войны (1939—1945). М., 1978. Т. 9. С. 64.
[4] Гл.: Купреева А. П. Народы СССР — трудящимся Белоруссии. Минск, 1981. С. 41; Олехнович Г. И. Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны (1941—1945). Минск, 1982. С. 102—103, 157.
[5] ЦПА ИМЛ при ЦК КПСС. Ф. 17, оп. 88, д. 607, л. 61.
[6] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 47, спр. 31, арк. 429.

М. Г. ЖАРКОВ

## ЗАКОНОМЕРНОСТЬ ОКТЯБРЬСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ И ЕЕ ИСКАЖЕНИЕ БУРЖУАЗНЫМИ ИДЕОЛОГАМИ

Победа Великой Октябрьской социалистической революции потрясла мир. Эксплуатируемые капитализмом трудящиеся, порабощенные им народы и государства увидели в Октябре путь к свободе, к новой человеческой цивилизации. «Монополистический капитал сразу же почуял, что Октябрьская революция представляет для него страшную опасность, угрозу капиталистическому господству не только в России, но и во всем мире»[1].

Наиболее пристальное внимание западных идеологов привлекают те аспекты истории пролетарской революции, которые продолжают сохранять свою актуальность. В первую очередь это относится к вопросу об исторической неизбежности, закономерности Октябрьской революции. Западногерманский историк О. Флехтгейм пишет, что в России отсутствовали для социалистической революции материальные и общественные предпосылки. Только очень высокая степень развития производительных сил и соответствующее полное развитие пролетариата и буржуазии позволяют ввести социалистическую форму общественного устройства[2]. В таком же духе высказываются советологи всех мастей — В. Леонгард, А. Арндт, А. Мейер, Р. Даниэлс, С. Хук[3].

Эти аргументы направлены против неприемлемой для буржуазии правды, суть которой в том, что Великая Октябрьская социалистическая революция, как и все социалистические революции, является неизбежным следствием закономерности исторического развития. Признание антимарксистскими авторами исторической закономерности Октябрьской победы было бы равносильно признанию ими неизбежности исчезновения из жизни (рано или поздно) капиталистической формации. Сомнения буржуазных скептиков в победе пролетарской революции и ее жизненности были опровергнуты В. И. Лениным в работе «Удержат ли большевики государственную власть?», написанную до октябрьских дней. В ней он, в частности, писал: «Одна справедливость, одно чувство возмущенных эксплуатацией масс никогда не вывело бы их на верный путь к социализму. Но когда вырос, благодаря капитализму, материальный аппарат крупных банков, синдикатов, железных дорог и т. п.; когда богатейший опыт передовых стран скопил запасы чудес техники, применение коих **тормозит** капитализм; когда сознательные рабочие сплотили партию в четверть миллиона, чтобы планомерно взять в руки этот аппарат и пустить его в ход, при поддержке